### Ад сэрца да сэрца

З кнігай Уладзіміра Ліпскага Ніну Канстанцінаўну Аверкаву пазнаёміла радыё: яе чытала народная артыстка Беларусі Марыя Юр'еўна Захарэвіч. Кранутая творам педагог стала разважаць пра тое, як з гэтага цудоўнага матэрыялу зрабіць нейкую сцэнічную кампазіцыю са сваімі студэнтамі. І калі да яе ў групу прыйшлі пяцёра студэнтаў, якія скончылі Магілёўскі каледж мастацтваў і ўжо мелі нейкую адпаведную адукацыю, яна прапанавала ім папрацаваць над такой творчай задачай. І адразу ж адчула: яны здолеюць яе вырашыць! Студэнты чыталі аповесць і плакалі, паказвалі кнігу сваім бацькам, былым выкладчыкам у каледжы і ў адзін голас казалі: «Як цудоўна! Якая цудоўна кніга!» Творчым працэсам захапілася ўся кафедра, усім было вельмі цікава, усе чакалі, што ж нарэшце атрымаецца. Працаваць было лёгка, нейкія карэктывы ўносіліся толькі па тэхніцы мовы, а вось да таго, што тычылася ўнутранага напаўнення, да гэтага не было ніякіх заўваг.

Ніна Аверкава упэўнена: кніга «Мама. Малітва сына» напісана сэрцам, і напісаў яе вялікі майстар слова. «Колькі з нашых вачэй выйшла шчырых, такіх ачышчальных душу слёз! — прызнаецца Ніна Канстанцінаўна. — Кожны са студэнтаў адчуў і перажыў матэрыял пасвойму. І гэта вельмі добра, таму што ў кожнага свой жыццёвы вопыт, але хлопцы і дзяўчаты добра ведалі і разумелі, пра што яны чыталі. Я думаю, што мы знойдзем шляхі і да іншых сэрцаў».

Пасля заканчэння імпрэзы Уладзімір Ліпскі паведаміў аб тым, што ён дамовіўся з беларускім радыё, каб гэты спектакль быў запісаны ў студыі — і такім чынам застаўся ў залатым фондзе беларускага радыё. Аўтар падсумаваў вынікі: «Будзем лічыць, што сёння знакавы дзень. Мне вельмі падабаецца беларуская народная мудрасць "Жыццё — не тыя дні, якія прайшлі, а якія запомніліся". Таму давайце запомнім гэты дзень, які мы пражылі пад знакам нашых мам! Я думаю, што калі кожны з нас зразумее таго чалавека, які вынасіў пад сэрцам і даў нам жыццё, і калі мы зробім усё, каб аддзячыць гэтаму чалавеку, то мы абудземся на гэтай зямлі, бо з гэтага, па сутнасці, і пачынаецца чалавек».



**Аляксандр КАМЕНЧУКОЎ,**
карэспандэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ